ПАСЛЯ НІЦЫ

Чаму Францыя стала галоўнай мішэнню для тэрарызму?

Сёння ў Францыі павінна было завяршыцца дзеянне рэжыму надзвычайнага становішча, уведзенае пасля нападаў у Парыжы ў лістападзе мінулага года. Краіна двойчы падаўжала яго: апошні раз — да 26 ліпеня, каб без эксцэсаў правесці Еўра-2016 і гонкі Тур дэ Франс (завяршыліся ў мінулую нядзелю). Але... «Мы не можам прадоўжыць надзвычайнае становішча на няпэўны тэрмін, у гэтым няма сэнсу. Гэта азначала б, што мы больш не з'яўляемся рэспублікай, у якой пануе вяршэнства закона пры любых абставінах», — заявіў прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд у Дзень узяцця Бастыліі. А ўвечары ў Ніцы вар'ят на грузавіку задушыў на Англійскай набярэжнай 84 чалавекі...

Дзеянне рэжыму надзвычайнага становішча ў Пятай рэспубліцы працягнута яшчэ на паўгода — да 26 студзеня 2017-га. Чаму Францыя стала галоўнай мішэнню для тэрарыстаў?

Ваколіцы Рэспублікі

Спачатку колькі красамоўных лічбаў. З чатырох тысяч еўрапейцаў, якія на баку баевікоў «Ісламскай дзяржавы» (ІД) удзельнічалі ў блізкаўсходнім канфлікце, паўтары тысячы складалі прадстаўнікі мусульманскай абшчыны Францыі. Цяпер яны, як сцвярджаюць шэраг аналітыкаў, быццам бы вярнуліся дадому і пачалі наводзіць парадкі, да якіх прывыклі за час тэрарыстычнай вайны на Блізкім Усходзе. Магчыма, гэта сапраўды так. Аднак у чым прычына нянавісці ісламістаў менавіта да Францыі?

Кіраўнік блізкаўсходніх даследаванняў Брукінгскага інстытута прафесар Дэніэл Байман у сваім артыкуле ў часопісе Slate піша, што пасля тэрактаў, учыненых алжырскай ісламскай групоўкай ў 1990-я гады, Пятая рэспубліка стала прытрымлівацца жорсткай пазіцыі ў дачыненні да тэрарызму. «З таго часу Францыя — суровы і дасведчаны вораг для прыхільнікаў джыхаду па ўсім свеце, — адзначае прафесар Байман. — Краіна рашуча прымае ўдзел у падзеях на Блізкім Усходзе — у прыватнасці, яна ўваходзіць у кааліцыю па барацьбе з ІД. Акрамя таго, Францыя правяла паспяховую, з пункту гледжання эксперта, ваенную аперацыю супраць ісламістаў у Малі».

І ўсё ж першапрычына, з пункту гледжання прафесара, заключаецца ў тым, што свецкая Францыя, прыняўшы вялікую масу мусульманскіх мігрантаў, толькі на першую пару паклапацілася пра іх належным чынам. Гуманітарная трагедыя перасяленцаў стала ператварацца ў пагрозу нацыянальнай бяспецы Францыі. На першы погляд, гэтая выснова Дэніэла Баймана пра неэфектыўнасць дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да мігрантаў крыху дысануе з устойлівым меркаваннем, што Францыя — краіна мультыкультуралізму і высокай верацярпімасці. Аднак яшчэ пяць гадоў таму ўплывовы французскі аналітычны цэнтр «Інстытут Мантэня» правёў даследаванне па чатырох пытаннях, што ўяўляюць прадмет спрэчкі аб французскай нацыянальнай ідэнтычнасці: іслам, іміграцыя, ідэнтычнасць і бяспека. Разам з пяццю іншымі французскімі даследчыкамі над гэтым на працягу года працаваў вядомы палітолаг і спецыяліст па мусульманскім свеце Жыль Кепель — кіраўнік праекта. Вынікам іх працы стаў 2200-старонкавы даклад «Banlieue de la Republique» («Прыгарады Рэспублікі»). Назва вельмі характэрная. Справа ў тым, што асноўнае даследаванне праводзілася ў двух прыгарадах на паўночным усходзе Парыжа: Клішэ-су-Буа і Манфермеле. Тут быў эпіцэнтр мусульманскіх пагромаў 2005 года. У гэтай частцы Парыжа адна з самых высокіх канцэнтрацый мусульман у Францыі. Клішэ і Монфермеле ўваходзяць у раён Сан-Сен-Дэні, які ў дакладзе названы «пусткаю дэіндустрыялізацыі». Колькасць насельніцтва Сан-Сен-Дэні — 1,4 млн чалавек. Мусульман тут жыве больш за 600 тысяч — пераважна з Паўночнай і Заходняй Афрыкі (дарэчы, насельніцтва Парыжа, паводле апошніх афіцыйных звестак, складае каля 2,3 млн чалавек.)

Аўтары дакладу (нагадаю, даследаванне датуецца 2011 годам) сцвярджалі: Францыя на мяжы сацыяльнага выбуху. Мусульманская супольнасць тут самая вялікая ў Еўрапейскім саюзе. Афіцыйна яе колькасць вызначаюць у 4,2 млн чалавек — 6,9% насельніцтва (дарэчы, у суседняй Германіі прыхільнікі ісламу складаюць 3,7% насельніцтва, а ў заакіянскіх Злучаных Штатах Амерыкі — 1,5%.) Даследчыкі з групы Жыля Кепеля называюць іншую лічбу — у Францыі ад пяці да шасці мільёнаў мусульман, іншыя аналітыкі кажуць і пра 8 млн. Розніца тлумачыцца проста — у некаторых раёнах трэць насельніцтва гарадоў не мае французскага грамадзянства.

Без дыплома

Пасля распаду французскай каланіяльнай імперыі ў 1950–1960-я гады некаторыя жыхары калоній, лаяльныя метраполіі, пераехалі з Азіі (у першую чаргу з Французскага Індакітая) і Афрыкі (у асноўным з Паўночнай) на тэрыторыю Пятай рэспублікі. Пераважная іх большасць атрымала французскае грамадзянства, такім чынам іх дзеці сталі французскімі грамадзянамі па нараджэнні. У перыяд эканамічнага ўздыму ў 1960-я ў Францыю таксама ўехала значная колькасць жыхароў былых калоній — у якасці таннай працоўнай сілы. Частка з іх пасля атрымала французскае грамадзянства. У тым ліку — нашчадкі перасяленцаў з краін Міжземнамор'я і Лацінскай Амерыкі, якія не ўваходзілі ў французскую каланіяльную імперыю.

Пры гэтым ісламская супольнасць не з'яўляецца традыцыйнай часткай дзяржавы. Яна ўся «імпартаваная» за апошняе паўстагоддзе. Большая частка французскіх мусульман жыве кампактна ў прыгарадах Парыжа, раёнах Марсэля і іншых буйных гарадоў, практычна лакалізаваная ў гета. Значная колькасць імігрантаў, як маламаёмныя, засяродзілася да пачатку 1980-х у кварталах з танным жыллём, якія былі пабудаваны ў 1960-я гады. У выніку гэтыя кварталы сталі набываць выгляд гета (з прыкметнай перавагай араба-берберскага і афрыканскага па паходжанні насельніцтва).

Па статыстыцы колькасць карэнных французаў, якія жывуць ніжэй за ўзровень беднасці, складае 10,6% насельніцтва, тады як сярод імігрантаў іх цэлых 28,5%, а ў некаторых раёнах даходзіць да 33,5%. Цесната і рэгіянальная абмежаванасць пражывання імігрантаў спрыяюць росквіту ўсякага роду негатыўных з'яў: крадзеж, гандаль наркотыкамі, бардэлі і іншыя крымінальныя «промыслы». Але самае сумнае — у такіх умовах зусім не працуе ні прынцып «плавільнага катла», ні «мультыкультуралізму». Вакол французскай сталіцы ўтварыліся, па сутнасці, калоніі чужынцаў, якія абвінавачваюць карэнных жыхароў краіны ва ўсіх бедах. З цягам часу тут зарадзіўся ўстойлівы прынцып: не ўдзельнічаць не толькі ў палітычным і сацыяльна-культурным жыцці Францыі, але і наогул успрымаць французаў як чужынцаў, ашуканцаў і ворагаў, якія завабілі і кінулі імігрантаў і іх дзяцей на чужыне на волю лёсу.

У краіне сфарміравалася паралельнае мусульманскае грамадства, якое не збіраецца інтэгравацца ў мясцовы сацыяльны асяродак. Яно знаходзіць сябе ў ісламскай ідэнтычнасці, дзе пануе закон шарыяту і ідэі радыкальных мусульманскіх лідараў. Старыя гарадскія прыгарады ў Францыі становяцца «аўтаномнымі ісламскімі суполкамі», адрэзанымі ад дзяржавы. Былі спробы інтэграваць іх у французскае грамадства. Скончылася ўсё заклікамі да ўзаемнай цярпімасці і неўмяшання ў жыццё суполак.

Перашкодай для інтэграцыі мусульман у мясцовы асяродак былі не толькі рэлігійныя і этнічныя адрозненні, але і сацыяльныя. Характэрнай прыкметай мігранцкіх абшчын быў нізкі ўзровень адукацыі, даходаў і нават матывацыі да працы. Францыя падтрымала іх дапамогамі, сацыяльнымі выплатамі, але гэта не змяніла агульную сітуацыю. Як адзначаюць даследчыкі, штогод дзясяткі тысяч маладых жыхароў тых жа Клішэ і Манфермеле пакідаюць школу без дыплома. У сучаснай эканоміцы неадукаванаму чалавеку няпроста знайсці годную працу. Таму ў прыгарадах Парыжа ўзровень беспрацоўя сярод мусульманскай моладзі набліжаецца цяпер да 50 працэнтаў.

Людзі становяцца залежнымі не толькі ад дзяржаўных сацыяльных дапамог, але і ад фінансавай падтрымкі з-за мяжы — з краін, якія пераследуюць свае ўласныя мэты. Праваднікамі адпаведнай палітыкі сталі радыкальныя ісламскія лідары, мясцовыя прапаведнікі, імамы. Як лічыць супрацоўнік Мадрыдскай групы стратэгічных даследаванняў С'ер Керн, цяпер большасць з 2100 зарэгістраваных у Францыі мячэцяў цесна звязаны з радыкальнай групоўкай «Браты-мусульмане». Яе мэта — распаўсюдзіць ісламскія законы на ўсю тэрыторыю Францыі. Зрэшты, мэты «Братоў-мусульман» выходзяць далёка за межы Пятай рэспублікі.

Пытанне без адказу

Ёсць у Пятай рэспубліцы яшчэ адна асаблівасць, якой, мабыць, няма ні ў адной еўрапейскай краіне: складнікам французскай нацыянальнай ідэалогіі з'яўляецца «лаіцызм» — дактрына свецкасці (laïcite), якая ўведзена ў адпаведнасці з законам 1905 года. Дзяржава жорстка аддзелена ад усіх рэлігійных арганізацый. Свецкі характар рэспублікі ўспрымаецца як ідэнтычнасць французаў і, больш за тое, як гонар.

Сутыкнуўшыся з актыўным распаўсюджваннем ісламізму, французскі ўрад яшчэ ў пачатку 2000-х увёў так званую палітыку секулярызму. Гэтая ідэалогія вельмі блізкая да крайняга атэізму, адхіляе любыя багаслоўскія сістэмы. Адмаўляючы рэлігію ў прынцыпе, секулярызм выступае за сацыяльны прагрэс і паляпшэнне ўмоў жыцця. Не ведаю, як наконт прагрэсу, затое адкрылася новае поле дзейнасці для ісламскіх прапаведнікаў, якія ўжо паспяхова іграюць на сацыяльных праблемах мусульманскай абшчыны.

«Цяпер тэракты праводзяцца ў рамках індывідуальнага джыхаду, — заўважае прэзідэнт расійскага Інстытута Блізкага Усходу Яўген Сатаноўскі. — У інтэрнэт запушчана дастаткова інфармацыі, каб ператварыць у тэрарыстаў любую колькасць людзей, якія хочуць быць тэрарыстамі. З рэкамендацыямі, што ім для гэтага трэба рабіць. Сацыяльныя сеткі, флэшмобы — гэта ўжо даўно выйшла на самараскрутку. І даўно ўжо частка нашага побыту. А еўрапейскія палітыкі гэтага не разумеюць».

Відавочна, што адным французам не справіцца з бядой, што іх апанавала. Поспех барацьбы ў ёй залежыць зараз ад агульных намаганняў усіх краін Еўрасаюза. Ці атрымаецца гэтага дабіцца? Пытанне, на якое пакуль няма адказу ...

Захар БУРАК. *burak@zviazda.by*

Приорбанк RZB Group

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2016 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 01 июля 2016	На 01 июля 2015
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		1 084 753	984 821
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		8 076	5 198
4	Средства в Национальном банке	1103		2 765 381	1 393 686
5	Средства в банках	1104		4 518 362	2 051 606
6	Ценные бумаги	1105		1 637 280	2 779 445
7	Кредиты клиентам	1106		14 310 324	14 150 168
8	Производные финансовые активы	1107		3 180	1 275 317
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		61 589	42 364
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		1 650 497	1 379 622
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		87 432	8 698
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		319 386	238 858
14	**ИТОГО активы**	11		**26 446 260**	**24 309 783**
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		-	10 271
17	Средства банков	1202		2 538 585	3 786 043
18	Средства клиентов	1203		18 656 066	16 120 809
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		80 533	73 528
20	Производные финансовые обязательства	1205		1 816	5 359
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		643 167	362 263
23	**ВСЕГО обязательства**	120		**21 920 167**	**20 358 273**
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		861 479	412 279
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		1 267 379	1 267 379
28	Фонды переоценки статей баланса	1214		781 481	709 805
29	Накопленная прибыль	1215		1 615 754	1 562 047
30	ВСЕГО собственный капитал	121		4 526 093	3 951 510
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	12		**26 446 260**	**24 309 783**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2016 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 01 июля 2016	На 01 июля 2015
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 670 802	1 564 177
2	Процентные расходы	2012		385 767	672 194
3	Чистые процентные доходы	201		1 285 035	891 983
4	Комиссионные доходы	2021		709 610	710 872
5	Комиссионные расходы	2022		165 832	120 545
6	Чистые комиссионные доходы	202		543 778	590 327
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		5 550	1 785
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(2 093)	(13 240)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		182 865	246 049
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		7 116	263 405
11	Чистые отчисления в резервы	207		576 360	621 491
12	Прочие доходы	208		71 148	128 551
13	Операционные расходы	209		822 721	600 811
14	Прочие расходы	210		46 756	49 183
15	Прибыль до налогообложения	211		647 562	837 375
16	Расход по налогу на прибыль	212		134 791	162 981
17	**ПРИБЫЛЬ**	2		**512 771**	**674 394**

Временно и.о. Председателя Правления С.И. Шишов

Заместитель главного бухгалтера С.И. Капцевич

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка: **https://www.priorbank.by/kvartal-nye-otcety**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.